


## САЛДАТАМІ НЕ НАРАДЖАЮЦЦА...

Як пісалі гумарысты, машына не раскоша... А цяпер і пагатоў... На ёй (дакладней, вядома ж, на іх...) хто толькі не ездзіць!

Алена, мая таварышка, здала на правы ў сталым узросце — незадоўга да пенсіі. Яна б, можа, і раней... Муж не дазваляў. Казаў: «Адно і тое ж — што жанчына за рулём, што малпа з гранатай», нават прыклад таму прыводзіў — жонкі свайго дружбака. Тая неяк паруліць захацела. Муж дазволіў: ну чаму б і не, калі просіць — па роўнай грунтоўцы, пад яго наглядам...

Карацей — усё добра было б, калі б на дарогу не вылаўз... вуж: вялізны такі, бліскучы. Кіроўца ўбачыла і... Дзіцячая рэакцыя (ці дзявочая?): крык, піск, ногі з педаляў, рукі з руля...

Шчасце, што муж яго перахапіў!

...Але ж і яны, тыя мужы, за рулём далёка не анёлы: у іх таксама прыгоды бываюць. Аленін вось неяк расслабіўся пад добры шансон — педаль газу моцна прыдушыў, трапіў у ДТЗ, пазбавіўся правоў. А без іх ды машыны ж, як без рук, да таго ж з непрывычкі...

Так што нідзе не дзеўся бядак: жонцы, што называецца, «ласку зрабіў» — дазволіў пайсці на курсы.

...Лена там самая старэйшая была (астатнія — ва ўзросце ўнукаў), аднак Дзімона, інструктара па ваджэнні, яе ўзрост чамусьці не бянтэжыў (ва ўсякім разе спачатку)... Гэта потым хапіла ўсяго. Іх машына чамусьці глухла часцяком (пераважна на скрыжаваннях), яна ж час ад часу любіла палохаць фуры — выязджаць на сустрэчную паласу альбо «рассякаць» па двайной суцэльнай...

А неяк на павароце Алена не збавіла хуткасць, і машына ледзь не нырнула ў абрыў. Вось тады ўжо Дзімон, які дагэтуль нервова курыў у фортку, сказаў, што яму да пенсіі — не тое, што некаторым, і ён хацеў бы дажыць...

Як бы там ні было — вочы баяцца, а рукі робяць...

І дарогу таксама адольвае той, хто ідзе. Альбо ездзіць.

Экзамены — і па тэорыі, і па ваджэнні — Алена здала паспяхова, атрымала правы, раз'язджае сама, часам падвозіць мужа. І той (па чутках) нават рады ўжо, ганарыцца перад сябрамі, Лену, здараецца, Шумахерам заве.

Не за прыгожыя ж вочкі?

**Таццяна Раманава,**

*г. Наваполацк.*

## ЭСТАФЕТА ДАБРЫНІ,

### альбо «Міхалыч, будзь чалавекам...»

Сталым чытачам нагадваць не варта: былі часы, калі партыя казала: «Трэба», камсамол адгукаўся: «Ёсць!».

Такім чынам, па яго пуцёўцы наша сяброўка Ліля ад'язджала на цаліну. Мы з Нінай пайшлі на вакзал, каб яе праводзіць. Прычым не проста так аркестр паслухаць ды рукамі памахаць, — разам з Ліляй зайсці ў вагон, хоць трохі праехаць, а потым вярнуцца назад...

Мы «добра» прыдумалі. І ўсё, можа, так і было б: Ліля з Нінай пайшлі займаць месцы... Мне ж карцела купіць марозіва, для ўсіх. А я куляй, як быццам, панеслася ў буфет, а калі вярнулася, цягніка ўжо і след прастыў.

Шчыра: у мяне тады столькі гора было, столькі слёз... Далібог, не меней, чым у Ніны прыгод!

«Значыць, зайшлі мы ў вагон, паселі, — расказвала потым яна. — Поезд, чуем, крануўся. Мы едзем, ва ўсе вочы глядзім у акно. Бачым, што праехалі Мядзведку і Асінаўку... Там цягнік чамусьці не спыніўся, а прамой наводкай, як той казаў, панёсся далей — аж да самай... Оршы (ад Віцебска гэта 90 км).

Туды мы прыбываем а палове дзясятай раніцы. Я выходжу з вагона, кірую да кас, каб паехаць назад, і бачу, што цягнік у мой Віцебск адпраўляецца толькі... позна ўвечары, што білет каштуе амаль дзесяць рублёў (шчасце, што яны ў кішэні — мама дала), але ж мне цэлы дзень трэба нечым займацца і нешта есці...

Гуляю да помніка Заслонаву і далей... Бачу, што лавачак шмат... А ўжо колькі пахаў... Там піражкі прадаюць, там — булачкі, там — какаву... І ўсё не для мяне!

Але ж голад не цётка — здаюся: за 50 капеек бяру сабе булачку. А білет пасля — толькі да Мядзведкі: ну не з'явіцца ж кантралёры пасля гэтай станцыі, на пад'ездзе да Віцебска?!

Марна было спадзявацца: не паспела ўзрадавацца, што амаль даехала, як яны, тыя грозныя дзядзькі, зайшлі ў цягнік. Я тут жа сiганула на верхнюю паліцу і прытварылася, што моцна сплю...

Дзядзькі пабудзілі — папрасілі паказаць білет. Я працірaю «заспаныя» вочы, корпаюся ў сумачцы, дастаю:

— Дык у вас жа толькі да Мядзведкі, — кажа адзін з кантралёраў. — А яна ўжо ззаду... Ты, дзеванька, што — праспала?

— Як?! — «панікую». — Што ж мне рабіць? Ні капейкі грошай...

— Добра, — уздыхае старэйшы з дзядзькоў, — едзь да Віцебска. Адтуль да тваёй Мядзведкі таварняк хутка пойдзе. Я свайму чалавечку запіску напішу.

Кантралёр і праўда дастае якісьці лісток, выводзіць на ім: «Міхалыч, будзь чалавекам, пасадзі гэтае дзяўчо на таварняк да Мядзведкі. Мікола».

Ну і далей тлумачыць, куды з гэтай запіскай пайсці, каму аддаць... А мне ж ужо не трэба было...»

Такім вось чынам Ніна дабралася да Віцебска, дзе яе зачакаліся знерваваная мама, радня, сяброўкі...

Але ж кропку ў гэтай гісторыі ставіць рана, бо праз нейкі час і на тым жа вакзале ў адказ на дзіцячае «Хачу булачку... Дзеда, купі...» Ніна пачула старэчае «Не, дзіцятка... У нас грошай няма», і тут жа ўспомніла сябе: падбегла да прадавачкі, набрала вафель, булачак, кексаў, напітку, аддала той унучцы з дзедам...

А потым дома выцягнула з кніжкі пажоўклы лісток, яшчэ раз прачытала: «Міхалыч, будзь чалавекам...» і падумала, што гэта ж зусім нескладана, няцяжка — быць...

**Зоя Наваенка,**

*г. п. Падсвілле, Глыбоцкі раён.*

## АДКЛАД НЕ ІДЗЕ Ў ЛАД

...Супрацоўніца расказала, як некалі яе маці зварыла варэнне, дала ім з братам пакаштаваць, а ўсё астатняе, у трохлітровым слоіку, схавала на зіму.

Дзеці «знайшлі» раней (нават на гарышчы), адкрылі слоік, наеліся самі, паклікалі сяброў, а каб «схаваць канцы», налілі ў слоік вады.

Варэнне, вядома ж, забрадзіла. Маці падумала, што сама вінаватая (мала цукру дадала) і пусціла прадукт на гарэлку...

Трохі падобная гісторыя была і ў нас.



...Тады, у канцы 60-х гадоў мінулага стагоддзя, за працу ў калгасе ўжо сталі нешта плаціць, і калі бацькі трымалі гаспадарку ды ўдваіх працавалі, а дзяцей было не сямёра, то нядрэнна і жылі.

Нас мама гадавала адна, і мы з сястрой толькі потым, у сталым узросце, змаглі ўявіць, як жа яна гаравала! Часта недаядаючы і недасыпаючы, мама ўвесь час клапацілася, думала пра нас: каб хоць адзеліся і абуліся, каб мелі ўсё для вучобы, каб у нас, як у іншых дзяцей, і па ровары было, і па лыжах... Ну і на стале — каб мяса, каб масла, каб свая гародніна-садавіна... Добра, што тата (ён рана памёр) вялікі сад нам пакінуў — з яблынямі, грушамі, вішнямі...

У той год на дзіва ўрадзілі слівы! Гэта падзея першая. Другая — у госці да нас прыехала маміна сястра, наша любімая цётачка Таня. А трэцяя — яна сказала, што будзе «ставіць кампот»: шмат, у трохлітровых слоіках. А мы потым — увосень, зіму ці вясну — будзем адкрываць і піць...

Такога цуду ў нашай вёсцы яшчэ не было! Мы з сястрой, глытаючы слінкі (салодкага, цукру хацелі заўжды), досыць доўга адсочвалі працэс прыгатавання, а потым, калі госця паехала, упрасілі матулю адкрыць хоць адзін трохлітровік...

Якая ж там была смаката! Проста зроду такой не елі! Ад слоіка адарвацца не маглі!

Але ж мама прывучала нас да ашчаднасці, таму я, старэйшая, сказала, што кампот трэба расцягнуць на некалькі дзён, а на разе, каб спакусы не было, засунуць яго... пад ложак. Такім чынам, свята жывата атрымалася ў нас і назаўтра.

На трэці дзень кампот не здаваўся ўжо такой смакатой. А на чацвёрты мы і зусім адвярнуліся насы... Праўда, маме прызнацца ў гэтым ну ніяк не маглі...

Выкінуць слівы курам ці свінням — таксама не выпадала, бо раптам застануцца костачкі і па іх мама ўсё зразумее.

Факт, што слоік з рэшткамі кампоту і сліў мы з жалем занеслі пад дзяддзеву ігрушу і вылілі.

Потым дзён колькі яшчэ бегалі глядзець, што з яго засталося.

...Не паверыце: горка прыгожых слівавых костачак аж да сёння ў мяне ў вачах — разам з сорамам перад мамай і цётачкай Таняй, разам са шкадобай, што такі прадукт аддалі мурашам, не змаглі з'есці самі, не хапіла розуму.

**Таццяна Новік,**

*г. Клецк.*

**Рубрыку вядзе Валянціна ДОЎНАР.**

Неасабісты суб'ектыў



# ЦВІК З РОДНАГА ДОМА

### Што трэба ведаць пра спадчыну і адказнасць

СЁЛЕТА нам пашанцавала з нечаканым набыткам. Сяброўка пачала рабіць рамонт у кватэры нядаўна памерлай бабулі і вырашыла пазбавіцца ад старой мэблі і дываноў. Аддавала, лічы, дарма — за самавываз. Адмаўляцца грэх было — у вясковай хаце зусім старыя шафы: і для адзення, і кніжная, і сервант. Купілі іх бацькі ў пачатку 1960-х гадоў, як толькі пачалі станавіцца на ногі, у растэрміноўку. Калісьці мэбля была дыхтоўная і прыгожая, паліраваная, як тады модна было. Але дзесяцігоддзі карыстання, а яшчэ больш — холад і вільгаць, якія пануюць у хаце ўзімку ўжо пятнаццаць гадоў, бо ніхто тут не жыве, зрабілі сваю справу. Калісьці бліскучыя дзверцы сталі цьмяныя, з праплысінамі цвілі, якую не ўдавалася вывесці за лета. Нават люстры ў серванце ад старасці пакрыліся чорнай «пацінай». Карацей, калі засвяціла перспектыва займець даволі прыстойную секцыю сярэдзіны 1990-х ды яшчэ тры вялікія мяккія амаль новыя дываны на падлогу ўсяго за дзвесце пяцьдзясят рублёў (столькі каштавала перавезці з пагрузкай-разгрузкай усё гэта багацце з горада ў вёску), я адразу пагадзілася.

А потым... ці то засумнявалася, ці то засумавала. Прыехаўшы ў родную хату, доўга хадзіла па пакоях, гладзіла старую парэпаную мэблю, нібы развітваючыся з блізкім чалавекам. Вось у серванце пластыкавая белая ручка на дзверцах прыклееная карычневым клеем. А вакол — белыя разводы. Гэта я ў першым класе нейкім неверагодным чынам яе адламала і спрабавала прыклеіць сілікатным клеем. Які, вядома ж, ніяк не дапамог, толькі пакінуў плямы на цёмнай паліроўцы, а ручка так і засталася боўтацца на адным мацаванні. Ад заслужанага прачуханца ад бацькоў мяне тады выратаваў старэйшы брат, які якраз прыехаў з Мінска. У ягонай сумцы аказаўся цуда-клей з чароўнай назвай «Фенікс» — вельмі і доўгі час смярдзючы. Мы прыляпілі ім тую няшчасную ручку, а потым, калі старэйшая заходзіла ў пакой і пыталіся, чым гэта так смярдзіць, мы рабілі няўцямныя твары, паціскалі плячыма, па-змоўніцку пераглядваліся. Пасля, зразумела, усё раскрылася, але з гэтай нашай змовы ўсе толькі па-добраму пасмяяліся...

А на старым шыфаньеры, пэўна, тым жа сілікатным клеем прымацаваная папяровая выява прыбранай дзяўчынкі, праўда, ужо без адной нагі. Ніхто і не здагадаецца сёння, што гэта Алёнка з шакаладкі. У поўны рост, ні каліва не падобная на сучасную. Алёнцы з шафы — дакладна больш за сорак. Кожны, хто прыязджаў да нас у госці, лічыў сваім абавязкам прывезці Алёнцы (мне, значыць) менавіта «Алёнку». Госці былі з розных куткоў вялікай краіны, і «Алёнкі» былі абсалютна розныя. Мы з мамай акуратна іх выразалі і наклейвалі... усюды, дзе нам падабалася. Гэту, што захавалася на шафе, здаецца, прывёз з украінскага Днепрапятроўска дзядзька Валодзя, мамін брат...

Я добра памятаю, як бацькі прынеслі з крамы ў суседняй вёсцы вялізны цяжкі дыван. Яны цягнулі яго ў руках тры кіламетры, але ў хату зайшлі з радаснымі ўсмешкамі. Разгарнулі ў зале — і ён заняў усю падлогу. А мы, малыя, кінуліся радасна качацца па гэтым яркім чырвона-жоўтым дзіве (а яно ў вясковай хаце пачатку 1980-х гадоў сапраўды было дзівам). Што цікава — колеры на тым паласы амаль не палінялі, хоць ён і заплямлены, і зашмальцаваны — вядома, столькі ног па ім за гады прайшлося...

Зусімі гэтымі ўспамінамі, разам з якімі са мной па бацькоўскай хаце хадзілі нябачныя цені дарагіх людзей, якіх ужо няма, я ўжо амаль перадумала штосьці мяняць, бо гэта здавалася амаль здрадай у адносінах і да гэтых людзей, і да ўласнага дзяцінства. Але пасля разважыла інакш. Гэта проста жыццё, і яно проста працягваецца. Пэўна, падобную настальгію адчувае кожнае пакаленне спадчыннікаў. Але ж разам са спадчынай і ўспамінамі мы атрымліваем яшчэ і адказнасць за гэтую самую спадчыну, за яе догляд, за яе захаванне. Што было б, калі б наш бацька, які нарадзіўся і вырас у гэтай хаце, марнаваўся маімі сумненнямі? У ёй бы дзесяцігоддзямі стаяў стары драўляны ложак і паточаны шашалем куфар, бо гэта нагадвала яму маленства?..

На наступныя выхадныя мы рабілі перастаноўку. Заўзята парадкавалі ў новых прыгожых шафах кніжкі, якія чытала не адно пакаленне, вясёлкавыя ад часу хрустальныя келіхі побач з новым сервізам, адзенне і абутак усіх памераў (летам у нас збіраецца вялікая сям'я). Малеча радасна качалася і скакала па чыстых мяккіх дыванах...

АДЗІНАЕ, што я не дала вынесці з хаты, — старую радыёлу «Рыгонда». Такую нярэдка можна ўбачыць у сучасных фільмах пра савецкія часы. Памятаеце, такая з масіўнымі белымі «вачыма», адным з якіх рэгулявацца гук, а другім лавіліся хвалі на прыёмніку, з прыладжаным унізе дынамікам, абцягнутым жаўтаватым палатном. Яна ўжо даўно не працуе, дый наўрад ці калі ўдасца знайсці на замену перагарэлыя ў ёй лямпы. Атрымаўся проста прадмет інтэр'еру, па сумяшчальніцтве — невялікі столік. Але кружэлкі ад яе мы таксама чамусьці пакінулі. Сярод іх я са здзіўленнем знайшла тую, што асабліва любіла слухаць у дзяцінстве, — «Цвік з роднага дома». Шведскую казку пра хлопчыка Свэнда, якому, куды б ён ні пайшоў і што б ён ні рабіў, гэты самы цвік, які ўзяў з сабой са сцяны роднай хаты, заўсёды дапамагаў жыць і заставацца самім сабой... Мне не ўдасца ўжо яе паслухаць, але яна, як і ўсё астатняе, заўсёды будзе са мной, будзе часткай мяне. І гэта, напэўна, галоўнае, што трэба ведаць пра спадчыну і адказнасць.

**Алена ЛЯЎКОВІЧ.**